# КАНФЕСІЙНЫЯ АСПЕКТЫ ПРАДМОВЫ ДА «БІВЛІІ РУСЬКАЙ» Ф. СКАРЫНЫ

***І. П. Клімаў,***
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт,*
*дацэнт кафедры беларускай і замежнай філалогіі*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

У прадмоўна-пасляслоўнай спадчыне Ф. Скарыны прадмова «ва ўсю» «Бивлию руску», якую выдаваў беларускі асветнік у Празе, займае асаблівае і важнае месца. Яна вылучаецца не толькі сваім памерам і абагульняючым характарам зместу, але таксама і раскрыццём павучальнага ды пазнавальнага значэння ўсяго біблейнага зводу [7, с. 118].

Паводле зместу і кампазіцыі прадмова выразна падзяляецца на дзве часткі: у першай даецца агульная ацэнка Бібліі, у другой пералічваюцца (з кароткімі каментарыямі) творы, што складаюць саму Біблію. Першая частка звычайна становіцца аб'ектам увагі даследчыкаў, паколькі менавіта ў ёй Скарына багата разважае пра значэнне гэтай базавай кнігі хрысціянства.

А. Яскевіч ужо спрабавала даць стылістычную характарыстыку гэтай частцы [8, с. 87–90, 94–95]. Даследчыца ўбачыла тут рытарычна арганізаваную прозу і элементы казання, а таксама анафары, фразавыя паралелізмы, звароткавыя формы, эліпсіс, рытарычны зварот і рытарычны вокліч [8, с. 89–90]. На яе думку, гэтая частка пабудавана на чаргаванні пытання і адказу [8, с. 94–95]. Сапраўды, твору ўласцівыя разнастайныя рытарычныя прыёмы і стылістычныя сродкі.

Біблія выступае для Скарыны як універсальная крыніца ведаў [5, с. 86–87], не толькі рэлігійных, але і філасофскіх, гістарычных, прававых, навуковых [4, с. 42–43]. Паказальны наступны фрагмент дадзенай прадмовы:

«В сей Книзе Всее прирожоное мудрости зачало и конець; богъ вседержитель познаванъ бываеть. В сей Книзе вси законы и права – ими же люде на земли справоватися имають – понисаны суть. В сей Книзе вси лекарства, душевные и телесныє, зуполне знайдете. Ту навчение философии добронравное – яко любити бога для самого себе и ближнего для бога – имамы. Ту справа всякого собрания людского и всякого града, еже верою, соединениемъ ласки и згодою посполитое доброе помножено

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

баваеть. Ту Научение седми наукъ вызволеныхъ достаточное». (Цытуецца паводле арыгінала, арк. 2, адв. 3).

Далей Скарынай пералічаны сем «вызваленых» навук, якія складалі аснову тагачаснай заходнееўрапейскай вучонасці (трывіум: граматыка, логіка, рыторыка; квадрыум: музыка, арыфметыка, геаметрыя (геаграфія), астраномія) і служылі перадумовай вывучэння філасофіі і, галоўнае, тэалогіі. Беларускі асветнік падкрэсліў сувязь гэтых навук з асобнымі кнігамі Бібліі. Ці не кожная з біблейных «кніг выступае ў якасці сімвала канкрэтнай навукі ці пэўнага мастацтва – граматыкі, логікі, рыторыкі, музыкі, арыфметыкі, геаметрыі, астраноміі, этыкі і інш.» [2, с. 111]. Згодна з С. Падокшыным, сваёй задачай Скарына лічыў далучэнне простага і паспалітага чалавека да адукацыі, ведаў, да сямі вольных навук: граматыкі, логікі, рыторыкі, музыкі, арыфметыкі, геаметрыі, астраноміі [5, с. 12, 87].

Скарына не спыняецца на гэтым комплексе заходнееўрапейскай вучонасці, ён дадае да яго таксама «военные а богатырские дела» (займальныя аповеды), «летописець много тысещей леть» (гісторыю) і «науки и мудрости добрых (н)равов» (этыку). Такім чынам, ён пералічыў усе веды і мастацтвы тагачаснага грамадства з адной мэтай: паказаць, што для іх вывучэння дастаткова «чести Библию». У ёй хаваецца не толькі ўся боская, але і свецкая, Арыстоцелева мудрасць [3, с. 94]. Праўда, Біблія для Скарыны – не адзіная крыніца, адкуль можна чэрпаць навукі і мастацтвы [4, с. 43], яго далягляд ахоплівае таксама іншую літаратуру (прыгодніцкую, гістарычную, этычную) і нават фальклор (напрыклад, вусныя аповеды этычнага зместу).

Падобны погляд на суадносіны навукі і Бібліі (у шырокім сэнсе – рэлігіі наогул) трэба прызнаць каталіцкім, у прыватнасці тамісцкім. Згодна з вучэннем Фамы (Тамы) Аквінскага, доктара (г. зн. аўтарытэтнага вучонага) каталіцкай царквы, паміж ісцінамі рэлігіі і навукі няма прынцыповых разыходжанняў, паколькі і чалавечыя веды, і містычны вопыт – усё спараджэнні адзінага Бога. Вера і веды знаходзяцца ў гармоніі паміж сабой і ў самым агульным сэнсе не супярэчаць адна адной, гэта проста розныя шляхі, што вядуць да адной мэты [1, с. 196]. І хаця ісціны навукі і рэлігіі знаходзяцца на розных узроўнях, яны далёка не аўтаномныя. Задача навукі – раскрыць, патлумачыць таямніцы веры, рэлігіі.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Цікава, што падобны погляд прысутнічае таксама ў сучасным ісламе. Ён зыходзіць з пазіцыі гармоніі паміж навуковай і рэлігійнай ісцінамі. Навука і ісламская рэлігія не могуць супярэчыць адзін аднаму, паколькі і прырода, і Каран аднолькава створаны Алахам. Фундаментальныя ісціны закладзены ўжо ў Каране, і пры спазнанні аятаў гэтай кнігі можна спазнаць усе законы сусвету, больш таго, аяты – гэта натуральныя законы, што ўтвараюць аснову навукі [1, с. 202–203]. Магчыма, падобны погляд, выпрацаваны ў ісламе ў эпоху Сярэднявечча, быў засвоены ў каталіцкай царкве ў эпоху крыжовых паходаў, што і рэпрэзентуе пазіцыя Фамы Аквінскага.

У больш раннія часы мусульманская рэлігійная думка выпрацавала адваротны погляд на гэтае пытанне. Так, знакаміты ў Еўропе арабскі мысляр Ібн Рушд (вядомы пад лацінізаваным імем як Авероэс) падзяляў рэлігію на рацыянальную, дасяжную адукаваным знаўцам, і вобразна-алегарычную, дасяжную ўсім, таму рэлігія для Ібн Рушда – гэта рацыянальныя ісціны, апранутыя ў алегарычную форму [1, с. 201–202]. Аднак для яго існавалі ўсё ж дзве ісціны: навуковая і рэлігійная, якія знаходзіліся ў адносінах дадатковай дыстыбуцыі: тое, што было сапраўдным у рэлігіі, магло з'яўляцца несапраўдным у навуцы, і наадварот [1, с. 194]. Падобныя ідэі падзялялі і заходнееўрапейскія мысліцелі датамісцкай эпохі (напрыклад, Джон Салсберыйскі) [1, с. 194]; цалкам падзяляюцца яны і пратэстантызмам [1, с. 194].

Гэтыя раннія ісламскія і хрысціянскія ідэі блізкія ці тоесныя праваслаўным [1, с. 192], тады як тамісцкая пазіцыя, як і пазіцыя сучаснага іслама, якраз непрымальная для праваслаўя. У праваслаўі разуменне чалавекам прыроды далёка нераўназначнае спасціжэнню ім Бога. Разуменне прыроды (у. л. розныя навукі) толькі пачатковая ступень у спасціжэнні чалавекам рэчаіснасці, і толькі зносіны з Богам уяўляюць сабой найвышэйшую ступень спазнання і сэнс быцця чалавека. Іншымі словамі, адкравенне (г. зн. містычны вопыт), а не навука дае сапраўдную ісціну. Таму і Біблія не прэтэндуе на тое, каб даць навуковае ўяўленне пра чалавека і свет, яе мэта – навучыць спасцігаць нябеснае ў зямным [6, с. 158–159]. Больш таго, сапраўдныя веды магчымы толькі праз містыку (яе выражэннем можа служыць інтуіцыя), якая глыбей і паўней пранікае ў таямніцы навакольнага свету, дазваляе спасцігнуць неспасці-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гальнае [1, с. 159–161, 164–166]. Таму містычныя веды фактычна супрацьстаяць ведам рацыянальным. Вобласці веры і навукі адносяцца да розных аспектаў ці ўзроўняў быцця, а таму з'яўляюцца аўтаномнымі, фактычна самастойнымі ў сваім існаванні [1, с. 200; 6, с. 158]. На погляд свят. Рыгора Паламы, навука і рэлігія крочаць рознымі шляхамі, якімі немагчыма прыйсці да адной і той самай ісціны; іншымі словамі, яны супярэчаць адна адной.

Як адзначаў прат. Іван Меяндорф [9], на каталіцкім захадзе тэалогія была навука хоць і вышэйшая за ўсе іншыя навукі, але паводле сваіх прынцыпаў і методык такая, як і астатнія навукі (напрыклад, філасофія), тады як у праваслаўнай Візантыі тэалогія ніяк не магла раўнацца з іншымі навукамі, быць часткай нейкай сістэмы ведаў.

Пры такім падыходзе выкладзены Скарынай погляд пра эквівалентнасць чалавечых навук таямніцам Бібліі трэба прызнаць неправаслаўным і выразна каталіцкім, тамісцкім у прыватнасці. Гэта, праўда, яшчэ не сведчыць пра каталіцызм самога Скарыны, а толькі пра каталіцкасць яго гнасеалогіі ў дадзеным фрагменце. Гэта не дзіўна, калі ўлічыць біяграфію і інтэлектуальнае выхаванне Скарыны, гадаванца некалькіх універсітэтаў, доўга жыўшым у заходнім, каталіцкім свеце.

Аднак побач з гэтым фрагментам у прадмове да ўсёй «Бівліі руськай» трапляюцца і дастаткова праваслаўныя пасажы.

Кваліфікацыю Бібліі ў сваім творы Скарына пачынае з тэорыі Івана Багаслова пра два сэнсы біблейных тэкстаў [5, с. 83–84; 7, с. 133–134]: «Книги написаны внутрь и зовнутрь» (арк. 2). Адпаведна, Скарына вылучае эзатэрычныя і экзатэрычныя кнігі ў складзе Бібліі, ці, паводле С. Падокшына, рацыяналістычны і алегарычны спосабы інтэрпрэтацыі Св. Пісьма [5, с. 86, 88–91]. Адны «написаны суть … сиє Книги внутрь духовне е разумеющимъ о тайнахъ превеликихъ божиихъ» (арк. 2), іншыя «написаны теж и зовнутрь, понеже не толико Докторове, а люди вченые в нихъ разумеють, но всякий человек простый и посополитый, чтучи … или слухаючи, можеть поразумети, что естъ потребно к душному спасению его» (арк. 2-2 адв.). Затым Скарына згаджаецца з Рыгорам Вялікім, які «добре ... о сей книзе пишеть: Святое писмо все иныє науки превышаеть» (арк. 2 адв.). Такім чынам, беларускі асветнік, канстатуючы прымат Бібліі і наогул рэлігіі над навукай, набліжаецца тут да праваслаўнай пазіцыі.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сваю размову на гэты конт Скарына скончвае фразай пра хуткаплыннасць і нетрываласць чалавечых навук: «мы, Хр(и)стиане, Ведаючи все науки быти минущие, потребуемъ речи вечноє Душного спасения» (арк. 3 адв.), ён заклікае аўдыторыю «уставичне» чытаць Евангелле. Так, напрыканцы першай часткі да ўсёй «Бівліі руськай» Скарына вяртаецца да пазіцый, якія можна прызнаць даволі праваслаўнымі. Менавіта гэты фрагмент можна разглядаць як выступ супраць тамісцкай канцэпцыі суадносін навукі і рэлігіі [4, с. 42].

Аднак вельмі далёка заходзіць А. Яскевіч, якая лічыць Скарыну аж арэапагітыкам, паколькі ў яго творах бачная іерархічная будова свету [8, с. 37–38, 40]. На яе думку, арэапагітычныя схільнасці Скарыны ілюструюцца кампазіцыйнымі момантамі прадмоў: пералікамі, сінанімізацыямі і градацыямі, да якіх так схільны Скарына [8, с. 37–38, 41–42]. Яна сцвярджае, што Скарынавы «метад тлумачэння біблейскіх тэкстаў» выступае і «як метад пазнання» [8, с. 41]. Згодна з даследчыцай, Скарына «заставаўся паслядоўным апафатыкам», доказам чаго яна лічыць Арыстоцелевае «неразуменне» ў прадмове да кн. Быцця [8, с. 38]. Ёй «кідаецца ў вочы ... праваслаўная сутнасць дзейнасці Ф. Скарыны» [8, с. 56], і яна ўпэўнена, што Скарына меў «паслядоўна праваслаўную арыентацыю» [8, с. 30]. Аднак рагледжаны пасаж пра суадносіны «вызваленых» навук і кніг Біблii ў прадмове Скарыны паказвае, што гэта далёка не так, яму не былі варожыя і каталіцкія погляды.

Пазіцыю Скарыны можна акрэсліць як эклектычную, што сумяшчае каталіцкі і праваслаўны погляды на суадносіны навукі і рэлігіі. Гэта можна тлумачыць як выпадковым збегам акалічнасцяў, так і свядомым выбарам асветніка, які жадаў пазнаёміць аўдыторыю на сваёй радзіме з канфесійна рознымі падыходамі. Аднак здаецца, што падобная канфесійная стракатасць у прадмове да ўсёй «Бівліі руськай» абумоўлена розным паходжаннем крыніц асветніка (заходнія і ўсходнія), якія выкарыстоўваліся для стварэння прадмовы. У такім выпадку трэба з насцярогай адносіцца да сцверджанняў і сентэнцый у прадмовах беларускага асветніка. На іх падставе ў савецкія і нават паслясавецкія часы былі зроблены далёкасягаючыя высновы пра многія погляды Скарыны як у рэлігійнай сферы, так і навуковай. Аднак нельга выключаць, што тыя або іншыя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выказванні ў яго прадмовах маглі быць механічна запазычаны з розных крыніц і не адлюстроўваць сапраўдных поглядаў Скарыны.

1. *Алиева, Б. А.* Теория двойственной истины и метод предметного разграничения в современной теологии / Б. А. Алиева // Наука и теология в XX веке: Критика теологических концепций науки. – М., 1972. – С. 193–205.

2. *Конан, У. М.* Эстэтычныя і маральна-этычныя сімвалы ў творчасці Скарыны / У. М. Конан // Спадчына Скарыны : зб. матэрыялаў Першых скарынаўскіх чытанняў (1986) / укл. А. І. Мальдзіс ; АН БССР. – Мінск, 1989. – С. 107–112.

3. *Падокшын, С. А.* Філасофская думка эпохі Адраджэння ў Беларусі : Ад Францыска Скарыны да Сімяона Полацкага / С. А. Падокшын ; пад рэд. А. С. Майхровіча. – Мінск, 1990.

4. *Подокшин, С. А.* Скорина и Будный: Очерк философских взглядов / С. А. Подокшин. – Минск, 1974.

5. *Подокшин, С. А.* Франциск Скорина / С. А. Подокшин. – М., 1981.

6. Православие и современность: (Философско-социологический анализ) / АН УССР ; ответ ред. Б. А. Лобовик. – Киев, 1988.

7. *Чамярыцкі, В. А.* Літаратурныя крыніцы скарынаўскіх прадмоў / В. А. Чамярыцкі // Спадчына Скарыны : зб. матэрыялаў Першых скарынаўскіх чытанняў (1986) / укл. А. І. Мальдзіс ; АН БССР. – Мінск, 1989. – С. 113–139.

8. *Яскевіч, А. А.* Творы Ф. Скарыны. Жанравая структура. Філасофскія погляды. Мастацтва слова / А. А. Яскевіч. – Мінск, 1995.

9. *Meyendorff, J.* Theology in the Thirteenth Century: Methodological Contrasts / J. Meyendorff // Καθηγήτρια: Essays Presented to Joan Hussey for Her 80th Birthday. – Camberley / Currey, 1988. – P. 395–407.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## СТАНАЎЛЕННЕ БЕЛАРУСКАГА ТЭАТРАЗНАЎСТВА ў першай палове XX ст.

***Л. Г. Клімовіч,***
*кандыдат мастацтвазнаўства,*
*старшы выкладчык кафедры тэатральнай творчасці*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

Эвалюцыя тэатральнай крытыкі першай паловы XX ст. абумоўлена некалькімі фактарамі: самасцвярджэннем беларусаў як нацыі, станаўленнем і развіццём беларускага прафесійнага тэатральнага мастацтва. Крытыка асэнсоўвала пошукі твор-